Газета дзяржаўнай установы адукацыі
"Грычынскі вучэбна-педагагічны комплекс яслі-сад –базавая школа"



# Перапынак!



№7
Сакавік, 2021

Школа - гэта родны дом,
Дружна тут усе жывём,
Пра падзеі ў школьным свеце
Мы раскажам у газеце!

## Чытайце ў нумары:

"8 сакавіка" стр. 2

Урок мужнасці стар. 3

Дзень Канстытуцыі стар. 4

Акцыя "Сябруем з Законам" стар.5

Весткі з дзіцячага сада стар. 6

# "8 сакавіка"



У Дзень жаночы такі прыгожы
Дасылаем мы віншаванне
Вам, шаноўныя, вам, харошыя,
Хай збываюцца пажаданні:
Каб было ў вашых сэрцах светла,
Не пакіне няхай здароўе,
Усё жыццё будзе поўным букетам
З кветак шчасця, дабра і любові!

Па традыцыі, напярэдадні свята навучэнцы нашай установы падрыхтавалі канцэртную праграму, у якой з вялікай шчырасцю і любоўю павіншавалі сваіх матуль, бабуль, сяброўак са святам. Песні, вясёлыя тэатральныя сцэнкі, цудоўныя вершы і словы прагучалі ў гэты дзень!













# Урок мужнасці



9 сакавіка нашу школу наведалі прадстаўнікі вайсковай часці г. Фаніпаля. Навучэнцы і педагогі атрымалі шмат станоўчых эмоцый, пачулі вялікую колькасць захапляльнай інфармацыі аб службе ў арміі, зброі і нават самі, на кароткі час, змаглі адчуць сябе салдатамі Узброенных сіл .









# Дзень Канстытуцыі

Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь - гэта сапраўднае свята Годнасці і Незалежнасці. Да Асноўнага закону, па якому жыве сучасны народ, краіна прайшла доўгі шлях: ад Статута Вялікага княства Літоўскага да Канстытуцыі суверэннай Беларусі.

В нашай установе традыцыйна ў гэты дзень навучэнцы, якім споўнілася 14 гадоў, атрымоўваюць кнігу "Я - грамадзянін Рэспублікі Беларусь". Са словамі віншавання да школьнікаў звярнулася дырэктар школы Марыя Міхайлаўна Казлова і пажадала быць дастойнымі грамадзянамі нашай краіны




Атрымаўшы падарункі навучэнцы ўсклалі кветкі да помнікаў загінуўным аднавяскоўцам





# Акцыя "Сябруем з Законам"

З 19  па 31 сакавіка наша школа прымала ўдзел у прафілактычнай акцыі “Сябруемз Законам!»

Для навучэнцаў было падрыхтавана шмат мерапрыемстваў, якія накіраваны на выхаванне законапаслушных паводзін, прыняцця імі маральных і духоўных каштоўнасцей, прапаганду здаровага ладу жыцця. Дзеці былі не толькі слухачамі, але і актыўнымі ўдзельнікамі прапанаваных мерапрыемстваў.














# Весткі з дзіцячага сада




Вясну мы пачалі з віншавання нашых дарагіх мам і бабуль. А працягнулі сакавік вясельымі гульнямі, спартыўнымі святамі і віншаваннем сваіх сяброў










